26.02.2024 / 02:47

# Марзалюка ўсё ж прызначылі дэпутатам. Прагноз «НН» на выбары спраўдзіўся на 97%

**Цэнтрвыбаркам назваў імёны пераможцаў выбараў у Палату прадстаўнікоў. Прынцыповых сенсацый ніякіх не адбылося — зрэшты, і не магло адбыцца.**

**«Наша Ніва» давала свой прагноз наконт таго, якія людзі будуць прызначаныя ў Палату прадстаўнікоў. Мы ўгадалі 107 са 110 чалавек. Гэта 97% дакладнасці.**




Чытайце. 110 дэпутатаў, якія трапяць у парламент-2024, — праверце спіс пасля выбараў

Нашыя прагназісты дапусцілі тры прыкрыя памылкі. Прычым усе ў Магілёўскай вобласці. Менавіта там мясцовыя ўлады традыцыйна заблытваюць сітуацыю, выпускаючы на выбарчы

**забег прыблізна роўных па статусе прэтэндэнтаў. Гэтыя кандыдаты загадзя ведаюць, хто з іх пераможа, а вось грамадству ўгадаць складаней.**

Апроч таго, праз тэхнічную памылку толькі ў Магілёўскай вобласці не апублікавалі спіс даверaных асобаў кандыдатаў. А праз гэтыя пералік пасадаў гэтых людзей можна атрымаць падказку наконт сур'ёзнасці кандыдата.

1) На акрузе №79 у Бабруйску перамогу напісалі начальніцы ўпраўлення персанала «Белшыны» **Аксане Прыходзька** (1975). Яна сябар ЛДПБ — партыі, якая атрымала найменшая прадстаўніцтва ў парламенце.

Мы меркавалі, што больш шанцаў у Андрэя Чайкі з Бабруйскага гарбарнага завода. Ён таксама збіраў подпісы ў сваю падтрымку, але хаця б вылучаўся ад «Белай Русі», што заўсёды павышае шанцы на перамогу.

2) У Крычаўскай акрузе №83 пераможца — **Сяргей Давыдаў** (1974). Ён начальнік Крычаўскай дыстанцыі шляху Магілёўскага аддзялення Белчыгункі — пасада не надта прадстаўнічая.

Зрэшты, яго канкурэнт Васіль Новікаў, які ўзначальваў Клімавіцкія электрасеткі, таксама не зусім «дэпутацкую» працу. Хоць электрасеткі — не прысуд. На суседняй акрузе ў парламент трапіў кіраўнік Бабруйскіх электрасетак.

3) На жаль, мы не паверылі ў **Ігара Марзалюка** (1968). Супраць яго гуляў асноўны аргумент — нікому, апроч спікера Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Андрэйчанкі, не дазвалялася пераабірацца тры разы запар. І якраз на Магілёўшчыне пастаянна здараліся выпадкі, калі пракатвалі кагосьці з цяперашніх дэпутатаў.

Апанент Марзалюка выглядаў даволі салідна — прарэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта Дзмітрый Рагаўцоў і сабраў подпісы, і вылучаўся ад калектыва, і быў прадстаўніком «Белай Русі». Але ўсё ж яго запісалі ў аўтсайдары гонкі.

Мы нарабілі тлуму яшчэ з адной акругай — Магілёўскай сельскай №88. Тут адназначна і без усялякай інтрыгі пераабіралася дэпутатка Наталля Тарасенка. Раптоўна мы знайшлі на сайце Магілёўскага райвыканкама файл з інфармацыяй пра яе зняцце. Мы пазванілі памочнікам Тарасенкі па каментар, але яны нічога не ведалі пра яе зняцце, нават запэўнілі, што «яна ж узгодненая». Тым не менш файл ёсць файл, мы палічылі яго існаванне важным аргументам! У такім разе безальтэрнатыўнай пераможцай мусіла станавіцца спарынг-партнёрка дэпутаткі. І толькі 25 лютага мы зразумелі, што Тарасенка працягвае ўдзельнічаць у гонцы, а яе зняцце адбывалася ў 2016 годзе і з таго часу вісіць на сайце райвыканкама і індэксуецца пошукавікамі. Натуральна, што Тарасенка і перамагла.

**А вось агульны спіс новых дэпутатаў:**

# Брэсцкая-Заходняя акруга №1

Валянціна Пух (1969), дырэктарка брэсцкага філіяла «Белпошты»

# Брэсцкая-Цэнтральная акруга №2

Вольга Сцепусь (1983), дырэктарка Брэсцкага абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па водных відах спорту

# Брэсцкая-Усходняя акруга №3

Уладзімір Баравенка (1970), ідэолаг з «Брэстаблгаза»

## Брэсцкая-Пагранічная акруга №4

Андрэй Крупенькін (1973), намеснік начальніка ўпраўлення КДБ па Брэсцкай вобласці

## Баранавіцкая-Заходняя акруга №5

Аляксей Райко (1987), намеснік начальніка Баранавіцкага аддзялення Белчыгункі

## Баранавіцкая-Усходняя акруга №6

Павел Папко (1983), дэпутат

## Баранавіцкая сельская акруга №7

Георгій Хлябовіч (1966), галоўны доктар Ляхавіцкай раённай бальніцы

## Белавежская акруга №8

Кацярына Паздзяйкіна (1984), начальніца лабараторыі Маларыцкага кансервавага камбіната

## Пружанская акруга №9

Юрый Наркевіч (1964), старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў

## Дняпроўска-Бугская акруга №10

Святлана Барташ (1969), дэпутатка

## Івацэвіцкая акруга №11

Алег Кузьмін (1972), дырэктар івацэвіцкай школы №3

## Кобрынская акруга №12

Паліна Васілюк (1980), начальніца аддзела ідэалагічнай працы і па справах моладзі Кобрынскага райвыканкама.

## Лунінецкая акруга №13

Эдуард Северын (1976), начальнік Брэсцкага аддзялення Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў

## Пінская гарадская акруга №14

Аляксандр Амельянюк (1964), дэпутат

## Пінская сельская акруга №15

Уладзімір Калесніковіч (1974), дырэктар «Пінскага ПМС» — прадпрыемства меліярацыйных сістэм.

## Столінская акруга №16

Аляксандр Вячорка (1974), кіраўнік спраў Столінскага райвыканкама.

## Віцебская-Горкаўская акруга №17

Віктар Нікалайкін (1961), дэпутат

## Віцебская-Чкалаўская акруга №18

Ірына Астапенка (1976), дырэктарка школы №46 Віцебска

## Віцебская-Чыгуначная акруга №19

Руслан Шкодзін (1973), ваенны камісар Віцебскай вобласці

## Віцебская-Кастрычніцкая акруга №20

Юрый Панфілаў (1966), кіраўнік Кастрычніцкага раёна Віцебска

## Гарадоцкая акруга №21

Андрэй Балыш (1988), дырэктар Віцебскага занальнага інстытута сельскай гаспадаркі Акадэміі навук.

## Докшыцкая акруга №22

Анатоль Сіўко (1976), дырэктар завода «Ветразь»

## Лепельская акруга №23

Віктар Азаронак (1974), намеснік старшыні Лепельскага райвыканкама

## Наваполацкая акруга №24

Дзяніс Карась (1978), дэпутат

## Аршанская гарадская акруга №25

Аляксандр Міхно (1968), дырэктар фабрыкі №2 Аршанскага льнокамбіната

## Аршанская-Дняпроўская акруга №26

Глеб Гулянкоў (1970), старшыня Балбасаўскага пасялковага выканкама.

## Полацкая гарадская акруга №27

Святлана Адзінцова (1964), дэпутатка

## Полацкая сельская акруга №28

Аляксандр Стома (1965), галоўны доктар Полацкай гарадской бальніцы.

## Пастаўская акруга №29

Ігар Сергеенка (1963), кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта

## Талачынская акруга №30

Уладзімір Бабічаў (1990), першы сакратар віцебскага абласнога БРСМ

## Гомельская-Юбілейная акруга №31

Віталь Уткін (1965), дэпутат

## Гомельская-Сельмашаўская акруга №32

Аляксандр Канапацкі (1988), намеснік дырэктара па ідэалогіі «Гомсельмаша»

## Гомельская-Цэнтральная акруга №33

Уладзімір Гаўрыловіч (1967), кіраўнік Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў

## Гомельская-Савецкая акруга №34

Ірына Даўгала (1967), дэпутатка

## Гомельская-Прамысловая акруга №35

Анжаліна Сырамятнікава (1970), намесніца дырэктара па ідэалогіі Гомельскага домабудаўнічага камбіната

## Гомельская-Навабеліцкая акруга №36

Сяргей Казачок (1973), кіраўнік Навабеліцкага раёна Гомеля.

## Гомельская сельская акруга №37

Юлія Волкава (1986), выкладчыца Гомельскага тэхнічнага ўніверсітэта імя Сухога.

## Буда-Кашалёўская акруга №38

Руслан Вегера (1980), намеснік дырэктара «Гомельэнерга»

## Жыткавіцкая акруга №39

Святлана Сянько (1981), намесніца старшыні Петрыкаўскага райвыканкама

## Жлобінская акруга №40

Аляксандр Малабіцкі (1977), начальнік аддзела інфармацыі Беларускага металургічнага завода.

## Калінкавіцкая акруга №41

Мікалай Маратаеў (1965), намеснік старшыні Гомельскага абласнога суда

## Мазырская акруга №42

Аксана Кавалькова (1969), дырэктарка школы №16 Мазыра

## Палеская акруга №43

Ала Навуменка (1969), старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў

## Рэчыцкая акруга №44

Алег Цылько (1971), намеснік дырэктара па ідэалогіі «Гомельаблаўтатранс»

## Рагачоўская акруга №45

Мікалай Кудзяньчук (1969), начальнік упраўлення аховы здароўя Гомельскага аблвыканкама

## Светлагорская акруга №46

Алена Лапцева (1972), дырэктарка Светлагорскага спажывецкага таварыства

## Хойніцкая акруга №47

Жанна Чарняўская (1971), дэпутатка

## Ваўкавыская акруга №48

Віктар Пляскач (1969), дырэктар Ваўкавыскага спажывецкага таварыства

## Гродзенская-Занёманская акруга №49

Міхаіл Аксянюк (1975), начальнік упраўлення ідэалагічнай працы Дзяржаўнага пагранічнага камітэта

## Гродзенская-Кастрычніцкая акруга №50

Алена Патапава (1978), дэпутатка

## Гродзенская-Ленінская акруга №51

Андрэй Анісімаў (1977), дырэктар гродзенскага філіяла «Белпошты»

## Гродзенская-Паўночная акруга №52

Алег Раманаў (1975), кіраўнік «Белай Русі»

## Гродзенская-Пагранічная акруга №53

Антон Кулісевіч (1967), старшыня Бераставіцкага райвыканкама

## Іўеўская акруга №54

Віталь Ракавец (1976), дырэктар Іўескага лясгаса

## Лідская акруга №55

Кацярына Серафіновіч (1965), намесніца дырэктара дзяржаўнай «ЛідаМедыяКампаніі»

## Нёманская акруга №56

Міхаіл Орда (1966), старшыня Федэрацыі прафсаюзаў

## Замкавая акруга №57

Аляксандр Сангін (1969), дэпутат

## Слонімская акруга №58

Валянцін Семяняка (1963), дэпутат

## Смаргонская акруга №59

Ігар Шалудзін (1968), старшыня Астравецкага райвыканкама

## Шчучынская акруга №60

Надзея Хальцова (1978), дырэктарка мастоўскай гімназіі №1

## Бярэзінская акруга №61

Юрый Корсік (1972), дырэктар Смілавіцкага дзяржаўнага каледжа

## Барысаўская гарадская акруга №62

Аляксандр Шыпула (1972), дэпутат

## Барысаўская сельская акруга №63

Руслан Касыгін (1968), намеснік па ідэалогіі завода «Аўтагідраўзмацняльнік». Гэта той самы Касыгін, які ў 2020—2023-м узначальваў ГРУ Мінабароны.

## Жодзінская акруга №64

Юрый Марэцкі (1972), ваенны камісар Смалявіцкага раёна і Жодзіна

## Пухавіцкая акруга №65

Алена Пархімчык (1968), галоўны доктар Пухавіцкага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі.

## Капыльская акруга №66

Андрэй Ліс (1976), начальнік упраўлення Следчага камітэта па Мінскай вобласці

## Слуцкая акруга №67

Наталля Аўсяннікава (1971), старшыня Слуцкага раённага Савета дэпутатаў

## Салігорская гарадская акруга №68

Алена Хаміцэвіч (1967), дырэктарка Салігорскага дзяржаўнага каледжа

## Салігорская сельская акруга №69

Аксана Ільковіч (1975), дырэктарка Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Любанскага раёна

## Стаўбцоўская акруга №70

Алена Клішэвіч (1971), начальніца ўпраўлення Нясвіжскага райвыканкама па спорце і турызме

## Дзяржынская акруга №71

Ірына Касцевіч (1967), міністарка працы і сацыяльнай абароны

## Маладзечанская гарадская акруга №72

Дзяніс Ушацкі (1977), начальнік маладзечанскага аддзела МНС

## Маладзечанская сельская акруга №73

Іван Маркевіч (1966), намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама

## Вілейская акруга №74

Святлана Сакалоўская (1970), першая намесніца старшыні Дзяржкантролю Мінскай вобласці

## Лагойская акруга №75

Таццяна Лаўрыновіч (1982), старшыня Лагойскага сельвыканкама

## Сеніцкая акруга №76

Анатоль Булаўка (1969), начальнік упраўлення ідэалагічнай працы Ваенна-паветраных сілаў

## Мінская сельская акруга №77

Алена Хіля (1975), дырэктарка Бараўлянскай сярэдняй школы №2

## Бабруйская-Ленінская акруга №78

Аксана Жук (1978), намесніца старшыні Бабруйскага гарвыканкама

## Бабруйская-Першамайская акруга №79

Аксана Прыходзька (1975), начальніца ўпраўлення персанала «Белшыны»

## Бабруйская сельская акруга №80

Антон Каранкевіч (1983), дырэктар бабруйскага філіяла «Магілёўэнерга»

## Быхаўская акруга №81

Аляксандра Міхеенка (1971), старшыня Касцюковіцкага райвыканкама

## Горацкая акруга №82

Уладзімір Паўлоўскі (1994), намеснік па ідэалогіі дырэктара Магілёўскага мясакамбіната

## Крычаўская акруга №83

Сяргей Давыдаў (1974), начальнік Крычаўскай дыстанцыі шляху Магілёўскага аддзялення Белчыгункі

## Магілёўская-Ленінская акруга №84

Ігар Марзалюк (1968), дэпутат

## Магілёўская-Цэнтральная акруга №85

Наталля Куляшова (1976), першая намесніца начальніка Інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Магілёўскай вобласці

## Магілёўская-Кастрычніцкая акруга №86

Галіна Бяляева (1978), намесніца па выхаваўчай працы дырэктара школы №34 Магілёва

## Магілёўская-Прамысловая акруга №87

Уладзімір Падабед (1975), старшыня прафсаюзнага камітэта «Магілёўхімвалакно». Квота Камуністычнай партыі.

## Магілёўская сельская акруга №88

Наталля Тарасенка (1970), дэпутатка.

## Асіповіцкая акруга №89

Алег Дзячэнка (1971), рэктар Акадэміі паслядыпломнай адукацыі.

## Шклоўская акруга №90

Валерый Малашка (1966), намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама

## Паўночная акруга №91

Дзмітрый Шаўцоў (1973), генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа

## Машынабудаўнічая акруга №92

Генадзь Ляпешка (1965), начальнік Вайсковай акадэміі

## Васняцоўская акруга №93

Сяргей Рачкоў (1960), старшыня камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі

## Купалаўская акруга №94

Ігар Пашкоў (1969), начальнік штаба Міністэрства ўнутраных спраў

## Свіслацкая акруга №95

Аляксандр Шпакоўскі (1984), дарадца-пасланнік Міністэрства замежных спраў

## Кастрычніцкая акруга №96

Сяргей Клішэвіч (1990), дэпутат

## Чкалаўская акруга №97

Вячаслаў Даніловіч (1973), рэктар Акадэміі кіравання

## Дзяржынская акруга №98

Настасся Мірончык-Іванова (1989), лёгкаатлетка

## Ясенінская акруга №99

Руслан Чарнецкі (1981), артыст Тэатра імя Горкага

## Паўднёвазаходняя акруга №100

Аляксандр Барсукоў (1965), памочнік Лукашэнкі па Мінску

## Заходняя акруга №101

Марына Лянчэўская (1971), дэпутатка

## Каменнагорская акруга №102

Міхаіл Мірончык (1966), дырэктар Дэпартамента кантролю якасці адукацыі Міністэрства адукацыі

## Кальварыйская акруга №103

Васіль Панасюк (1966), дэпутат

## Лынькоўская акруга №104

Анжаліка Курчак (1969), прэс-сакратарка Генеральнай пракуратуры

## Старавіленская акруга №105

Вадзім Іпатаў (1964), дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў

## Коласаўская акруга №106

Мікалай Бузін (1971), памочнік старшыні Палаты прадстаўнікоў

## Усходняя акруга №107

Наталля Дзяргач (1964), галоўная доктарка 34-й паліклінікі

## Першамайская акруга №108

Алег Гайдукевіч (1977), дэпутат

## Уручанская акруга №109

Іван Гардзейчык (1957), дэпутат

## Партызанская акруга №110

Вадзім Гігін (1977), дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі.

Nashaniva.com

ІГАР МАРЗАЛЮК ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ

## ЧЫТАЙЦЕ ЯШЧЭ

У Бешанковічах паставяць памятны знак у гонар Льва Сапегі 1

Тэрмін падачы падатковай дэкларацыі працягнулі на адзін дзень

«Пацукі, са сваёй краінай вы ці здраднікі?» Гладкая накінулася на «Анлайнер» 14

Арганізатары выбараў фактычна прызналіся ў фальсіфікацыях у Мінску. Сачыце за рукамі 7